ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАЯ ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ЗАСНАВАНА Ў 1920 г.

ПАГОНЯ

№ 44 (143) 24 - 30 лістапада 1995 г. Кошт 600 рублёў

ПРЫКЛАД БЯРУЦЬ З ПРЭЗІДЭНТА

Мінулы панядзелак у гарадзенскай школе N 30 заняткаў не было. Іх адмянілі пасьля таго, як нехта паведаміў па тэлефону, што ў будынак закладзена міна. Суровыя дзядзькі-міліцыянты далі загад усім тэрмінова пакінуць школу.

Міну не знайшлі. Але ёсьць другое. Гармідар і напружанасьць у грамадзтве, уседазволенасьць і беспакаранасьць. Якраз тое, што культывуе сваімі паводзінамі Прэзідэнт.

Што тычыцца міны, то міну, якую «заклаў» у сакавіку Аляксандр Рыгоравіч у Авальнай зале, таксама не знайшлі.

Ул.інф.

ДАРАГІЯ ПАДАРУНКІ

З 16 лістапада на баланс горада перададзены ўвесь жылы фонд Міністрэства абароны. Гэта будынкі па вуліцы Шчорса, прасьпекту Касманаўтаў і ўвесь Фолюш. На тое, каб гэтыя аб'екты арганічна ўліліся ў структуры гарадзкой маёмасьці патрэбна прыкладна 16 мільярдаў. Аднак да канца года гораду выдзелена толькі 1,4 мільярда. Ды і то на паперы. Вялізных сродкаў патрабуе і перадача ў падпарадкаванасьць гораду 40 тысячаў лецішчаў, 20 тысяч гаражоў і 4 тысяч дамоў індывідуальнай забудовы. Хутчэй за ўсё, у бліжэйшы час будуць уведзены новыя падаткі, каб хоць крыху кампенсаваць чакаемыя ад гэтых падарункаў страты.

В.ДРЭМА

ЛІЧЫЛЬНІКІ ДЛЯ ГАЗУ

У хуткім часе ў трох тысячах гарадзкіх кватэраў, да якіх падведзены газ, будуць устаноўлены лічыльнікі. У дадзены момант адпаведныя службы гарвыканкаму займаюцца абсьледаваньнем газавага сектару, каб высьветліць каму ставіць ільготныя лічыльнікі, а каму за поўны кошт. Усяго на вобласьць выдзелена пяць тысяч лічыльнікаў газу.

В.Д.



МІЛІЦЫІ НЕ ДА ВЫКАНАНЬНЯ СВАІХ АБАВЯЗКАЎ

ЯК СТАЦЬ ДЭПУТАТАМ
(ІНСТРУКЦЫЯ)

Дзеючая інструкцыя распаўсюджваецца на ўсіх жадаючых стаць дэпутатам любога ўзроўню. Па-за гэтай інструкцыяй застаюцца старшыні калгасаў і кіраўнікі мясцовых ворганаў улады - іх шлях у дэпутаты іншы. Але ім гэта і не патрэбна (гл.вынікі травеньскіх выбараў).

Па-першае, калі цябе вылучылі ў кандыдаты, ты павінен адхрысьціцца ад любых партый і рухаў, бо гэта толькі раздражняе выбаршчыкаў. БНФ -гэта, як усім вядома, фашысты; дэмакраты незалежна ад назвы партый (АДПБ, ПНЗ ці іншыя) - гэта балбатуны; камуністы - ужо мелі ўладу і што нарабілі; жырыноўцы, як вядома, - амаль што ўсе вар'яты. Толькі і застаюцца прыхільнікі піва, але яны ў выбарах не прымаюць удзелу.

Другая справа - на якой мове весьці агітацыю. Вядома, на дзяржаўнай. Але іх зараз дзьве. Вось і трэба весьці агітацыю на абедзьвюх. З тым, хто валодае толькі рускаю моваю - на рускай, хто размаўляе на беларускай - па-беларуску. А той, хто карыстаецца трасянкай - няхай чуе ад цябе адін сказ на рускай, а другі на беларускай мове. Гэта ўпэўніць кожнага з выбаршчыкаў, што ты ўсё зробіш так, як яны пажадаюць. А калі ты ня ведаеш беларускай мовы, то ў цябе няма іншага выйсьця, як у прэзідэнта: гаварыць, як Бог на душу пакладзе, але ўсім даводзіць, што ў сьвеце толькі дзьве вялікія мовы - руская і ангельская. У гэтым выпадку дазваляецца на заканчэньні размовы кідаць: «Гуд бай». (Барані вас Бог ляпнуць «Аўфвідэрзэн». Могуць накласьці ў карак).

Трэцяе з асноўных правіл. Вам патрэбна абраць для сябе лозунг. Ён павінен быць кароткі, гучны і бессэнсоўны. Напрыклад: «Закон вышэй усяго». Ці: «Дабрабыт, Справядлівасьць, Гонар». Горш гучыць: «Эканоміка павінна быць экалагічнай». Ад яго патыхае нечым непрыемным. Яшчэ лепей: «Розум, гонар і сумленьне», але гэты дэвіз ужо заняты. (Калі прапанаваныя дэвізы супалі з рэальна існуючымі, гэта супадзеньне выпадковае. Аўтар за гэта адказнасьці не нясе).

Што датычыцца палітычных поглядаў кандыдата, то пра іх лепей не разважаць наогул. Ціск трэба рабіць на тое, што ён зрабіў за сваё жыцьцё і на тое, што ён яшчэ зробіць для выбаршчыкаў. Раім даведацца ў жыльлёва-камунальным аддзеле, якія пытаньні хвалююць жыхароў раёну, дзе вы балатуецеся і ўсю сваю праграму будаваць на гэтых пытаньнях. Калі патрэбна заасфальтаваць дарогу, то вы павінны абяцаць, што асфальтаваць будзеце ўласнымі рукамі. Калі насельніцтва заелі камары, то, калі вас абяруць дэпутатам, вы з Японіі прывязеце сродак, ад якога дохнуць усе камары ў радыусе вашай выбарчай акругі. І ніводнага слова аб тых законах, якія вы будзеце распрацоўваць - гэта нікога не цікавіць.

Калі асабліва настырны і палітычна адукаваны жыхар будзе пытаць вас пра палітычныя погляды, то згаджайцеся з ім па усіх пазіцыях. Гарантуйце аднавіць усе ільготы, адмененыя прэзідэнтам, калі гэта пеньсіянер. Калі ён прыхільнік прэзідэнта, паразважайце з ім аб тым, як шыкоўна выглядае Лукашэнка побач з Ельцыным у спартыўных трусах.

А на ўсе астатнія пытаньні кажыце, што кандыдат вы незалежны, таму ўсе рашэньні будзеце прымаць самастойна, кіруючыся ўласным розумам. Пры гэтым патрэбна важна стукаць сябе па лбу. Не перастарайцеся -звон пры гэтым не павінен гучаць.

Ну, вось і ўсё.

Так, яшчэ на перадвыбарных улётках павінна быць фота з малымі дзецьмі. Калі няма ўласных, пазычце ў суседа. Я буду пільна сачыць за ходам перадвыбарнай агітацыі і калі кандыдаты будуць ужываць маю інструкцыю, то запатрабую ад іх сваю долю ў дэпутацкіх заробках.

Жадаю посьпехаў!

Максім ГОРКІ.

ДРУГОГА ХЛЕБА ХОПІЦЬ ДА КРАСАВІКА

На склады бальніцаў і дзіцячых садкоў горада закладзена дзьве тысячы трыста тонаў бульбы. Па разьліках сьпецыялістаў, гэтай колькасьці «другога хлеба» павінна хапіць да красавіка. Не павінна быць перабояў з бульбай і ў крамах Горадні. На гандлёвых базах яе назапашана дастаткова. Перазімуем зіму, а там і шчаўе пойдзе...

ГАСПАДАРСКІ ПАДЫХОД

На просьбу Расеі аб выдзяленьні тэрыторыі пад вайскова-марскую базу Украіна адказала таксай: за 1 кв.м сушы - 11 долараў у год, за 1 кв.м мора - 7 долараў. Адзін гектар мора дасьць ураджай у 20 разоў больш, чым гектар самай лепшай пшаніцы. І старшыня калгасу з аграномам не патрэбныя. Невялічкая база ў 100 гектараў зямлі і 100 гектараў мора дасьць 18 мільёнаў долараў у год. Вось бы нашага калгасьніка хто навучыў так ня сеяць і не жаць, а грошыкі зьбіраць.

Кастусь АЛЬГЯРДОВІЧ.

«НЁМАНСКАЯ» ПЛЫНЬ НЕ МЯЛЕЕ

Кожнае новае прадпрыемства, якому ў наш час удаецца падняцца з кален, выклікае да сябе пэўную цікавасьць. Адно з такіх прадпрыемстваў -Бярозаўскі шклозавод «Нёман». Нядаўна чацьвёрты раз пабывалі Бярозаўскія майстры са сваёй прадукцыяй на кірмашы ў Франкфурце-на-Майне. Найбольшую папулярнасьць меў тут посуд з простага бясколернага шкла. Заключаны кантракт на пастаўку такога посуду на суму каля паўмільёна марак.

Нямала вырабаў «Нёмана» знаходзіцца на кірмашы ў Маскве. Там за два дні заключаны кантракты больш чым на 50 мільярдаў рублёў. Гэта больш квартальнай магутнасьці завода.

Яраслаў ГРЫНЬКЕВІЧ.

ГОРАД НЕ ЗАМЕРЗЬНЕ?

Напярэдадні зімы многіх з нас хвалюе пытаньне - ці будуць заўсёды цёплымі нашы батарэі? На гэты час кацельныя «Гроднаэнэрга» забясьпечаны мазутам на 100%, што здавалася б , гарантуе стабільнае забесьпячэньне цяплом нашых кватэраў. Аднак ужо зараз зьявіліся праблемы. Так, у сувязі са спыненьнем вытворчасьці на заводзе N 10 спынілася праца кацельнай прадпрыемства, якая ацяпляла таксама два жылыя дамы і дзіцячы садок. Зараз вядзецца будаўніцтва новай цеплатрасы, каб да вялікіх маразоў людзі не засталіся без цяпла. Самае кепскае, што гэты выпадак можа стаць толькі першай ластаўкай. Менавіта так ахарактарызаваў сітуацыю мэр Горадні сп. Крупенка. Ён жа адзначыў, што ня выключана, што гарачая вада ў кватэры зімой можа падавацца па графіку, як гэта робіцца ўжо ў Навагрудку.

В.М.

ПІЦЬ МЕНЕЙ НЯ БУДЗЕМ

Аб'ём прамысловай прадукцыі ў цэлым па краіне за дзевяць месяцаў 1995 года зьнізіўся на 11% у параўнаньні з аналагічным перыядам 1994 года. Больш чым на 20% меней выраблена прадуктаў, на 30% меней прадуктовых тавараў, а вось выпуск алкагольных напояў упаў усяго на 5,1%. Але, пэўна, гэты паказчык будзе хутка выпраўлены, бо на Беларусі значна больш чым летась сабрана бульбы і цукровых буракоў і толькі на 10% меней збожжа. Сыравіны для гарэлкі хапае.

Ігнат ХІТРОВІЧ.

ЗАКАНЧВАЕЦЦА ПАДПІСНАЯ КАМПАНІЯ!

На **"ПАГОНЮ"** Вы можаце падпісацца ў любым аддзяленьні сувязі. Кошт падпіскі на паўгоддзе - 48 тысяч рублёў, на квартал - 24 тысячы, на месяц - 8 тысяч рублёў.

Не адкладвайце на заўтра тое, што можна зрабіць сёньня!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі Беларусі
"Белсаюздрук"

АБАНЭМЭНТ на газэту 63124

ПАГОНЯ

Колькасьць камплектаў 1

на 1995 год па месяцах:

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12
X	X	X	X	X	X						

Куды ______ (паштовы індэкс) ______ (адрас)

Каму ______ (прозьвішча, ініцыялы)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газэту 63124

ПВ | Месца | літар

ПАГОНЯ

Кошт	падпіскі	48000 руб.	Колькасьць камплектаў	1
	пера-адрасоўкі	руб.		

на 1995 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12
X	X	X	X	X	X						

Куды ______ (паштовы індэкс) ______ (адрас)

Каму ______ (прозьвішча, ініцыялы)

ГАЛАСУЕМ ЗА БЕЛАРУСЬ!



Грамадзяне Рэспублікі Беларусь! Колькі можна падманваць наш народ?! А.Лукашэнка абяцаў запусьціць заводы - і «запусьціў»: людзі па месяцамі не атрымліваюць заробак. Абяцаў падтрымку пеньсіянерам - і адабраў у іх бясплатны праезд, абмежаваў магчымасьць сумленна падзарабіць. А сам за дзяржаўны кошт набыў асабісты самалёт за 45 мільёнаў долараў, будуе сабе тэнісны корт за 70 тысяч долараў. Абяцаў свабоду прэсы - а ідзе шалёны наступ на незалежны друк, і гэта пры жорсткай прэзідэнцкай цэнзуры ўсіх дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі. Абураўся фільмам «пра сьцюардэсу» - а сам рэкламаваў ганебную фальшыўку Ю.Азаронка «Ненависть: дети лжи». (Да гэтых выбараў рыхтуецца чарговы паклёпніцкі фільм). Абяцаў вярнуць людзям уклады каляровымі тэлевізарамі і халадзільнікамі - дзе гэтыя «каляровыя халадзільнікі»? Абяцаў пасадзіць кебічаўскую мафію - і пасадзіў: у дзяржаўныя крэслы. Цяпер кажа, што яму даспадобы грашовая прыватызацыя. Дык у каго ж грошы? Хто скупіць нашыя заводы? Мы? Ці галоўныя «завхозы» з адміністрацыі прэзідэнта?

Сваімі неадукаванымі, непрафесійнымі дзеяньнямі канчаткова разваліўшы эканоміку, А.Лукашэнка спрабуе цяпер усталяваць у краіне дыктатарскі рэжым, дзе б выконваліся не законы, а толькі ягоныя загады. Для гэтага ствараецца велізарная сьпецназаўская ахова прэзідэнта, умацоўваюцца «сваімі людзьмі» сілавыя структуры. Прэзідэнту не патрэбны Вярхоўны Савет, які б абараняў інтарэсы нашай краіны, нашага народу, які не даваў бы транжырыць народныя грошы. Яму патрэбны кішэнны Савет, які б служыў шырмай для яго незаконных дзеяньняў. І зразумела, чаму А.Лукашэнка так паталагічна ненавідзіць Народны Фронт, чаму баіцца, што яго прадстаўнікоў выбяруць дэпутатамі. За ўсе гады свайго існаваньня БНФ «Адраджэньне» казаў людзям толькі праўду, якой бы горкай яна не была, пасьлядоўна і непадкупна абараняў інтарэсы нашага народу. І таму, нягледзячы на тое, што ў краіне існуе шмат партыяў і рухаў, асноўная прапаганда ўладаў вядзецца супраць Народнага Фронту. Бо ўлады выдатна разумеюць, што ўдзельнікі Народнага Фронту не дапусьцяць развалу дзяржавы, не дадуць абрабаваць наш народ, не дазволяць уцягнуць нас у чужыя войны.

Маючы дакладна распрацаваную праграму выхаду краіны з крызісу і высокаадукаваную каманду сумленных прафесіяналаў, БНФ «Адраджэньне» зьвяртаецца да грамадзянаў Рэспублікі Беларусь: давайце разам будаваць наш беларускі дом, каб у нашай краіне людзі жылі годна і заможна.

ПАТАЕМНАЕ СТАНОВІЦЦА ЯВАЮ

З крыніц, якія выклікаюць давер, стала вядома, што Гарадзенскім УКДБ завершана праверка фактаў хабарніцтва і карупцыі ва Упраўленьні службы кантроля прэзідэнта па Гарадзенскай вобласьці, дзе начальнікам зьяўляецца С.Гараеў. Матэрыялы па гэтым фактам накіраваны ў пракуратуру, якая ўзбудзіла крымінальныя справы ў адносінах да двух супрацоўнікаў службы кантроля - Ульяненкава Ігара Міхайлавіча і Стрыгі Валянціны Станіславаўны.

Спадар Ульяненкаў за суткі да ўзяцьця пад ахову адпаведнымі ворганамі быў тэрмінова звольнены па ўласным (?!) жаданьні са службы кантролю, таму што спадар Гараеў ведаў пра факты хабару з боку сваіх супрацоўнікаў. У адносінах да вышэй названых асоб вядзецца сьледства, а спадар Гараеў па сфабрыкаваным дакумантам змагаецца за мандат дэпутата Вярхоўнага Савету рэспублікі.

Ул. інф.

АБЯЦАНКІ-ЦАЦАНКІ...

Гарадзенскі штаб мясцовага корпусу распачаў інтэнсіўную палітычную дзейнасьць. Раз-пораз са штабу тэлефануюць у часткі і загадваюць выдзеліць па два ці больш вайскоўцаў з мэтай агітацыі за палкоўніка Кошалева. Добраахвотнікі на час агітацыі вызваляюцца ад службы, таму жадаючых хадзіць па Горадні ды наклейваць улёткі з плакатамі хапае. Гэта ж у любым выпадку лягчэй чым «цягнуць службу», хоць за агітатарамі сочаць.

А ўлёткі таварыша палкоўніка, нібыта мяхі пілавіньнем, набітыя фантастычнымі абяцанкамі. Некаторыя з іх: «Вярнуць савецкія нормы аплаты жылля і цэны на асноўныя прадукты харчаваньня, дзецям -піянерлагеры, маладым - працу, пеньсіянерам - хлеба ды лекаў, а мафіі - наморднік» (адзін ужо абяцаў...), а на дысерт, абяцанка даць роўныя правы ўсім - і прэзідэнту, і таму, хто зьбірае сьмецьце. Трэба, таварыш палкоўнік, ня толькі роўныя правы, а роўныя рэальныя магчымасьці, чаго дабіцца значна цяжэй.

ВАСЮК ЦІКАЎНЫ.

ЛЁС БЕЛАРУСІ ВЫРАШАЕЦЦА СЁНЬНЯ

Тое, у якім становішчы знаходзіцца Беларусь, абавязвае да самых рашучых дзеяньняў. Не пасьпеўшы стаць на дэмакратычны шлях разьвіцьця, яна трапіла ў лапы палітычных авантурыстаў, якія прывялі рэспубліку да неабальшавіцкай дыктатуры. Усе дзеяньні прэзідэнта скіраваны на пазбаўленьне Беларусі дзяржаўнасьці і супярэчаць прынятай канстытуцыі.

Тое, з якімі тэмпамі цяперашні кіраўнік дзяржавы праводзіць свае рашэньні ў жыцьцё, гаворыць аб тым, што да наступных прэзідэнцкіх выбараў Беларусь прыйдзе без іншай альтэрнатывы, акрамя як быць састаўной часткаю Расеі. Падмяўшы пад сябе ўсю заканадаўчую дзейнасьць і прыціснуўшы папярэдні парламант, ён робіць усё, каб не абралі новы. Калі ж новы парламант і будзе абраны, дык яму пагражае скаканьне пад прэзідэнцкую дуду. Канстытуцыю, згвалтаваную ўказамі Лукашэнкі, чакае заўчасная сьмерць, альбо замена прэзідэнцкай падсьцілкай.

Галоўная зброя прэзідэнта - абыякавасьць нашага народу да свайго лёсу і прышчэплены за гады савецкай улады страх перад вышэйстаячым начальствам. Працягваючы спойваць народ таннай гарэлкай і штучна трымаючы інфляцыю, прэзідэнт спрабуе захаваць прыхільнасьць народу, які марыць аб стабільнасьці. Гэтая тактыка палітычнага і эканамічнага авантурызму вядзе да незваротных вынікаў. Адразу пасьля выбараў нас чакае рэзкі скок цэн на фоне гіперінфляцыі. Народ зьбядняе яшчэ больш і трапіць у поўную залежнасьць ад рашэньняў «бацькі».

Настаў час спыніць самаўпэўненага кіраўніка, якому, у лепшым выпадку, можна даверыць камандаваньне бандай катоўцаў часоў грамадзянскай вайны, а не кіраваць дзяржавай у цэнтры Эўропы. Неабходна скаардынаваць усе апазіцыйныя патрыятычныя сілы дзеля актыўнай палітычнай барацьбы з хунтай, якая з кожным днём становіцца больш нахабнай.

Калі ж мы ня спынім сьляпога ад сваіх ідэй пастуха, то загінем у прорве. Ня ў нашай моцы зьмяніць мінуўшчыну, але будучыня ў нашых руках. Наша сіла - у еднасьці.

ЯНКА ТАТАРЫН

ЗВАРОТ ПАЛІТЫЧНАГА САВЕТУ АБ'ЯДНАНАЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ПАРТЫІ З НАГОДЫ ІГНАРАВАНЬНЯ ПРЭЗІДЭНТАМ РАШЭНЬНЯЎ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

У апошнія дні ў краіне адбыліся падзеі, якія яскрава зьмяняюць палітычную сітуацыю. Пасьля таго, як Канстытуцыйны суд адмяніў пяць указаў прэзідэнта, прызнаўшы іх антыканстытуцыйнымі, прэзідэнт публічна заявіў, што ня будзе выконваць рашэньні Канстытуцыйнага суда і патрабаваў ад усіх дзяржаўных органаў безумоўнага выкананьня сваіх антызаконных указаў.

Гэта значыць, што ўслед за непрызнаньнем заканадаўчай улады ў асобе Вярхоўнага Савету, у Беларусі фактычна ігнаруецца Канстытуцыйны суд. Такім чынам, можна канстатаваць, што ў краіне ўсталяўваецца рэжым асабовай улады, паколькі канстытуцыя спыніла дзейнасьць у поўным аб'еме. На месцы закона і права ў дзяржаве ўстанаўліваецца грубая сіла.

Аб'яднаная Грамадзянская партыя лічыць, што адказнасьць перад законам і гісторыяй будуць несьці разам з Лукашэнкам усе службовыя асобы, якія выконваюць адмененыя Канстытуцыйным судом антызаконныя ўказы прэзідэнта, а таксама партыйныя і грамадзкія рухі, якія спрыяюць парушэньню законнасьці.

АГП зьвяртаецца да ўсіх палітычных сілаў, палітычных партыяў, грамадзкіх арганізацый з заклікам стварыць шырокае грамадзкае Аб'яднаньне ў абарону канстытуцыі. Ягоная мэта - каардынацыя намаганьняў для ўстанаўленьня ў краіне канстытуцыйнай законнасьці, выконваньня рашэньняў Канстытуцыйнага суда, абароны дэмакратыі ад замахаў на яе з чыйго бы то ні было боку.

15 лістапада 1995 года Менск

ЯК ГАРАДЗЕНСКІЯ ЧЫНОЎНІКІ Ў ДЗЬВЮХ ПАРТЫЯХ ЗАБЛУКАЛІ

13 лістапада 1995 года Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь аднавіў рэгістрацыю кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь па Лідзкай Сельскай выбарчай акрузе N 135 Маўчуна Уладзіміра Мікалаевіча. Патугі адпаведнай акруговай камісіі зьняць яшчэ да выбараў канкурэнта галоўнаму вертыкальшчыку раёна Антону Блюдніку аказаліся марнымі.

Праўда, каб быць аб'ектыўным, трэба сказаць, што галоўную скрыпку тут граў не старшыня камісіі сп. Язэпаў, а чыноўнікі аблвыканкаму сп. Дайнэка і яго падначаленыя. Праявіўшы павышаную пільнасьць, яны запатрабавалі па кандыдатуры Маўчуна дадатковых зьвестак, хаця і ня мелі ніякага на тое права, бо сп. Язэпаў як старшыня камісіі ў ніякіх дачыненьнях з імі ня можа быць. Але, тым ня менш, былі запатрабаваны зьвесткі ці зьяўляецца сп.Маўчун сябрам абласной рады БНФ «Адраджэньне» і атрымалі ад старшыні рады Міколы Баўсюка інфармацыю, што не зьяўляецца. Усе довады, якія былі прыведзены пазьней, ніхто слухаць ня стаў і рэгістрацыя Маўчуна была скасавана таму, што «сп. Маўчун у раёне не жыве, не працуе і грамадзкай дзейнасьцю не займаецца». Цэнтральная Выбарчая Камісія пагадзілася з гэтым. А якжа Суд? А Суд на тое і суд, каб нарэшце ўбачыць, што Маўчун быў вылучаны Соймам Партыі БНФ, адной юрыдычнай асобай, а абласныя чыноўнікі ўвесь матэрыял зьбіралі па БНФ «Адраджэньне», зусім іншай юрыдычнай асобе.

Такім чынам, гарадзенскія чыноўнікі заблыталіся ў тым, што іх менскія калегі ўтварылі ў свой час, каб не дапусьціць Фронт да выбараў. Фронт тады своечасова стварыў для ўдзелу ў выбарах Партыю БНФ і выйшаў са становішча. Але ўсе юрыдычныя хітрасьці для правіцыі тыпа Гародні аказаліся недасяжнымі. Яны, напэўна, і зараз не зразумелі, што ж было ня так у іхняй файнай задуме.

ВАЦЛАЎ СЯРПІНСКІ

НА ВЫБАРЧЫЯ ЎЧАСТКІ РАІМ ІСЬЦІ А СЁМАЙ ГАДЗІНЕ

Згодна з Законам аб выбарах, галасаваньне за кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савету на выбарчых участках пачынаецца ў сем гадзінаў раніцы, а ў месцовыя Саветы - з шасьці гадзінаў. Паколькі выбары зараз будуць праходзіць у адзін дзень, можа ўзьнікнуць сітуацыя, што прыйшоўшы ў 6 гадзін выбаршчыкі змогуць прагаласаваць толькі за кандыдатаў у месцовыя Саветы. Таму раім усім выбаршчыкам - прыходзьце галасаваць а сёмай гадзіне!

В.Р.

І КУДЫ ГЛЯДЗІЦЬ ПАЗЬНЯК?

На радзіме лідара Беларускага Народнага Фронту «Адраджэньне» Зянона Пазьняка ў калгасе «Суботнікі» з траўня месяца не выплочваецца заработная плата. Але, тым ня менш, масавых палітычных шэрагаў БНФ тут няма. Мусіць, як мяркуе газета «Іўеўскі край», калгасьнікаў суцяшае тое, што яны не адны такія ў раёне.

Зьміцер ХІТРОВІЧ.





"БЕСПРЕДЕЛ" ПА-ВАЎКАВЫСКУ

Прымаючы ўдзел у выбарах 1990 года, усе ўскладалі надзею, што жыцьцё стане лепшым і дастойнейшым. Але надзеі не збыліся. Вярхоўны Савет у асноўным склала наменклатура і кіраўніцтва кампартыі. Парламант і ўрад Кебіча, у сілу сваёй ідэалагічнай зашоранасьці, не змаглі рэфармаваць эканоміку.

У 1994 годзе свае надзеі зьвязвалі з прэзідэнтам. Але і тут усіх чакала горкае расчараваньне. Ня гледзячы на абяцаньні і заклёны, жыцьцё даражэе, а мы бяднеем. Злачыннасьць і карупцыя растуць. Ні адна сям'я, ні адзін чалавек не мае ўпэўненасьці ў заўтрашнім дні. Указамі адмяняюцца Законы Рэспублікі Беларусь. Парушаецца Канстытуцыя. Надыходзіць прававы «беспредел». І такая сітуацыя поўнасьцю задавальняе тых, хто знаходзіцца пры ўладдзе. Усё гэта поўнасьцю адносіцца і да гарадзкіх улад. Ваўкавыскай гарадзкой выбарчай камісіі было адмоўлена ў рэгістрацыі кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Савету Беларусі 17 прадстаўнікам БСДГ. Афіцыйны адказ за подпісам старшыні камісіі Савіч А.А. не вытрымлівае ніякай крытыкі. Шчыры падман самой камісіі, якой быў зачытаны дакумант паўгадавой даўнасьці, да поўнага ігнараваньня Закону аб выбарах. Са свайго боку хачу толькі сказаць, што прадастаўлены былі ўсе дакументы, патрабуемыя законам. Кандыдатамі ад кампартыі было прадастаўлена у два разы меньш дакумантаў, і тым не менш. Чаму такое магчыма? Таму ш што ў гэтым «беспределе» яны адчуваюць сябе як рыба ў вадзе. Адкрытасьць, галоснасьць, законнасьць для іх сьмерці падобна. Ды яны баяцца нашых кандыдатаў таму, што нашымі стаўленьнікамі былі раскрыты многія злоўжываньні гарадзкімі ўладамі - ад разьмеркаваньня жыльля да шчырага хабару.

Таму Зайцаву і Бязносіку, «близнецам-братьям», патрэбен свой паслухмяны кішэнны гарадзкі Савет, а ня той Савет, які будзе абараняць інтарэсы жыхароў горада. Таму няцяжка прадказаць вынікі выбараў. Па-сутнасьці гэта не выбары, а прамое назначэньне. І ўжо сёньня можна назваць прозьвішчы новага старшыні горсавета, хоць да выбараў яшчэ амаль тры тыдні. Хто ж будзе прадстаўляць «нашы» інтарэсы?

1. Кароткая О.Н., работнік выканкама, якая ў час суцэльнага дэфіцыту, калі ўсё разьмяркоўвалася па сьпісках, брала мэблю без усякіх спіскаў. І калі ёй была зроблена заўвага, яна запярэчыла: я работнік выканкама і маю права браць без усякіх чэргаў! Чалавек з блакітнай крывёю.

2. Яўсейкін М.І., чалавек, прыехаўшы з адным чамаданам у г. Ваўкавыск, атрымаўшы каля 1 га зямлі па вул. Матросава, калі законам прадугледжана ня больш 15 сотак і пабудаваўшы двухпавярховы катэдж, не забіўшы ні аднаго цьвіка і ў час будаўніцтва адпачываўшы на поўдні.

У якасьці даведкі: інвалід, удзельнік вайны ў Аўганістане, так і ня змог атрымаць участак у рысе горада пад будаўніцтва дома.

3. Красільнікава Л.С., гэта давераная асоба самаго Зайцава, якога ў 1990 годзе ня выбралі ў двух акругах горада. І гэтыя людзі, зачыніўшы бальнічныя палаты на ключ, заставілі прагаласаваць за Зайцава нават памершага ў рэанімацыі.

4. Станкевіч Ю.І. Загадачык гарсабеса, які ў сілу сваіх службовых абавязкаў павінен клапаціцца аб прыстарэлых. Афоміў апеку за самотнай бабуляй і пасьля яе сьмерці аформіў ейную кватэру на сябе.

Гэта далёка ня поўны сьпіс, паколькі месца ў газеце абмежавана. Безумоўна, ня ўсе такія кандыдаты. Але гэта касьцяк і апора нашага «вертыкальнага». Гэтыя прычыны і з'яўляюцца сапраўднымі прычынамі ў адмове рэгістрацыі. З тых жа прычынаў не быў зарэгістраваны і я як кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Савету. Калі на травеньскіх выбарах ім удалося выбіць мяне, надрукаваўшы паклёпніцкі артыкул другога сакратара гаркаму камуністаў Кліковіча В.Д. у апошнім нумары перад выбарамі. паклёпніцкі характар дадзенай публікацыі даказаны ў судзе. Прыйдзецца сакратару камуністаў выплаціць 10 мільёнаў рублёў, якія я намераны перадаць у школу, і прынесьці публічныя выбачэньні. Зараз ім неабходна было выбіць мяне з выбараў. Задача спрасьцілася з-за таго, што маё вылучэньне ішло шляхам збору подпісаў, да якіх, па словах Бязносіка, не было прэтэнзій, хаця іх правяралі і члены камісіі, а таксама супрацоўнікі гарсабесу, якія абзваньвалі ўсіх, хаця яны не з'яўляюцца членамі камісіі і ня мелі права гэта рабіць. Усё гэта выклікала справядлівае абурэньне людзей. Фармальнай нагодай была заява аб згодзе балатавацца. Але і яна была напісана загадзя і маецца дакументальнае пацверджаньне гэтаму.

Усё гэта гаворыць аб тым, што супрацоўнікі выканкаму вельмі паважаюць мяне, а паважаюць таму, што ёсьць за што баяцца. У 1990 годзе супрацоўнікі гаркаму казалі: «Выбярыце Аксаміта дэпутатам, ён атрымае кватэру ў Менску і пакажа кукіш усяму гораду». Прайшло пяць гадоў - я ў Ваўкавыску. Паказалі яны тое самае, што вы называлі кукіш, два вашых прадстаўніка. Тады вы сталі распускаць чуткі пра катэджы, якія нібыта мае Аксаміт. Паважаныя камуністы, я з задавальненьнем замяню іх на вашы кватэры. Не атрымалася, не прыліпла. Таму пытаньне з рэгістрацыяй было прадвызначана. Ня гэтую дык другую прычыну вы бы прыдумалі. Гэтага ў вас не займаць. Выбары ўсёроўна адбудуцца, незалежна нават ад нашага Ваўкавыска. Ну а двум кандыдатам, я не кажу пра трэцьцяга камуніста (паколькі нават пажылыя людзі, нягледзячы на настальгію па таннай каўбасе, памятаюць, хто разбураў храмы, расстрэльваў сьвятароў, свае галасы не аддадуць), я жадаю ад чыстага сэрца: дай Бог вам зрабіць хаця б трэцюю частку таго, што было зроблена мной, адбыць свой дэпутацкі тэрмін і вярнуцца ў Ваўкавыск і з чыстым сумленьням паглядзець людзям у вочы і вылучыцца паўторна.

МІКОЛА АКСАМІТ

АБНАВІЛІСЯ

Вайскоўцам тэрміновай службы адной з гарадзенскіх часьцей вырабілі і «прапанавалі» купіць па два шэўроны коштам каля 60 -ці тысяч рублёў, што складае ўсяго ... суму зарплаты шэрагоўца за месяц. Вайскоўцы абураліся, бо меркавалі, што такія вырабы каштуюць значна таньней. Адзін з гэтых «унікальных» твораў упрыгожвае прэзідэнцкі сьцяг, а іншы - чорная лятучая мыш на жоўта-блакітным фоне. Надпісы выкананы па-беларуску і, нават, без памылак. А кажуць у нашым войску нічога ня ўмеюць. А яшчэ кажуць, што хутка трэба будзе на службу купляць «большой сов. керза».

А.ВАЙСКОВЫ

ЗАКАЗ НА СТОЙКІЯ ЛІХТАРЫ

Лідзкі завод электравырабаў атрымаў заказ мэра Масквы Юрыя Лужкова на выраб стойкіх ліхтароў. Мэта - паставіць заслону злачынствам у Маскве. Аказваецца, там бандыты спачатку разьбіваюць сьвяцільнікі, а пасьля ў цемнаце рабуюць людзей. Як паведаміў дырэктар завода Іван Каўчуг, электразаводцы заказ прынялі. Сьледам за Лужковым цікавасьць да вырабаў лідчан праявілі і ў адміністрацыі нашага прэзідэнта.

Ігнат ХІТРОВІЧ.

ТАНКАСУКОННАЕ АБ'ЯДНАНЬНЕ ПА-РАНЕЙШАМУ СТАІЦЬ

Адныя з самых горшых паказчыкаў сярод прадпрыемстваў прамысловасьці Горадні мае танксуконнае аб'яднаньне. Запазыка прадпрыемства ў момант спыненьня ў траўні вытворчасьці прадукцыі складала 20 мільярдаў. Сёньня такой сумай вымяраецца толькі запазыка па ссудам банкаў. Каля 5 мільярдаў аб'яднаньне вінавата энэргетыкам. Аб крытычным стане, які склаўся на прадпрыемстве, «Пагоня» пісала неаднаразова. Што ж зьмянілася зараз? Па вялікаму рахунку - нічога. На савеце кіраўнікоў прадпрыемстваў горада генеральны дырэктар аб'яднаньня сп. Лубянько сьцьвярджаў, што ёсьць заказ на паўшэрсьцяныя коўдры на суму 600 тысяч нямецкіх марак. Гэтыя коўдры немцы ў якасьці гуманітарнай дапамогі адсылаюць ў Югаславію. Калі энэргетыкі і банкі крыху пацерпяць, за два месяцы працы прадпрыемства крэдытам разьлічыцца з усімі пазыкамі. Але, падобна, цярпець ніхто ня хоча, і зразумець тых жа энэргетыкаў і банкіраў можна - чаму яны павінны губляць свае грошы?

Адзінай рэальнай справай, зробленай на прадпрыемстве за апошні час, зьяўляецца пераход на газавае паліва кацельнай. Для гэтага пабудавана 5 кіламетраў газапровада. З бюджэтных рэзерваў горада аплочана 600 тон мазуты.

Праўда, працягваецца разгрузка складоў. Калі ў момант спыненьня вытворчасьці на іх захоўвалася прадукцыі на 11 мільярдаў, то зараз -прыкладна на 500 мільёнаў. Яшчэ на 8 мільярдаў рублёў на прадпрыемстве знаходзіцца прадукцыі ў незавершаным стане. Здавалася б, запусьці вытворчасьць ды атрымай гэтыя мільярды. Але няма сэнсу -усе грошы пойдуць на ліквідацыю запазыкі, прычым ня ўсей, а толькі яе невялікай часткі.

Здаецца ў бліжэйшы час адным вялікім прадпрыемствам у горадзе стане менш...

В.ЛЮДВІКОВІЧ

РЫНАЧНЫ САЦЫЯЛІЗМ. ЛІЧБЫ І ФАКТЫ.

Набліжаецца да сканчэньня чарговы год жыцьця краіны. Ужо сёньня можна падвесьці некаторыя яго вынікі, прааналізаваць абвешчаны прэзідэнтам «рынычны сацыялізм» у дзеяньні.

Пачнем з сельскай гаспадаркі. Днямі яе прадстаўнікі адзначылі сваё прафесійнае сьвята, але з добрым настроем сустрэлі яго хіба што абраныя ў Вярхоўны Савет «аграрыі». Так, наўмысна бяру гэтае слова ў двукосьсе, бо рука не падымаецца назваць земляробамі тых, хто давёў вёску «да ручкі», а зараз лезе яго «ратаваць». Дзе вы былі раней? Каго падтрымлівалі? За што галасавалі?

Атрыманы ў гэтым годзе ўраджай збожжавых склаў 28,4 цэнтнера з гектара, што амаль на 10 цэнтнераў ніжэй, чым у 1991 годзе. За год уся краіна здолела купіць толькі два новыя камбайны. У два разы менш накапала бульбы. На 1/3 скарацілася прадукцыя жывёлагадоўлі. Ды і як можа быць інакш, калі літр малака каштуе ў краіне нашмат таней, чым пляшка ліманаду. Калгасная сістэма ў стане агоніі. Калгасьнікі месяцамі не атрымліваюць сваю мізэрную зарплату.

Кінеш працу - застанешся бяз сотак, бяз хатняй гаспадаркі. Здавалася б - ідзі ў фермеры, закон дазваляе. Сёньня ў вобласьці каля 350 фермерскіх гаспадарак з агульнай зямельнай плошчай больш чатырох з паловай тысяч гектараў (па 12-13 га на гаспадарку). Для параўнаньня - у ЗША сярэдні памер фермерскай гаспадаркі - 420 гектараў, у Галандыі - 64 гектары. Дык чаму ж так мала людзей заняліся сваёй справай на зямлі? Няўжо астатнім так добра жывецца ў калгасах? Не! Беларускі ўрад пры падтрымцы «аграрыяў» усімі сродкамі душыць фермера, бо варта таму ўстаць на ногі - калгасы кануць у нябыт, а за імі ўся аснова гэтак старанна будуемага «рыначнага сацыялізму».

Ня лепшая сітуацыя і ў прамысловасьці. На 70% прадпрыемстваў горада за 10 месяцаў 1995 года адбыўся спад вытворчасьці. Так, у параўнаньні з адпаведным перыядам 1994 года тэмпы роста вытворчасьці на танкасуконным абьяднаньні склалі ўсяго 9%, на пальчаткавай фірме «Акцэнт» - 65%, прадпрыемтсве мастацкіх вырабаў «Сузор'е» - 49%.

Агульная дэбеторская запазыка прадпрыемстваў горада дзяржаўнаму бюдэту сёньня складае 240 млрд. рублёў, крэдыторская - 320 міліярдаў. З іх 19 - за энэрганосьбіты, 23 млрд. - за газ, 3 млрд. - за цеплаэнэргію, 7,5 млрд. - за ваду. Самыя буйныя пазычальнікі -»Хваля», прадзільна-ніткавае абьяднаньне, гарбарны завод, КБМ не разьлічыліся яшчэ за мінулы год. 19,3 мільярды рублёў дзяржаўнаму бюджэту павінен горад, 400 мільярдаў - вобласьць.

Сем прадпрыемстваў горада сёньня стратныя. Гэта «Хваля», «Радыёпрыбор», танкасуконнае абьяднаньне, завод такарных патронаў, прадзільна-ніткавае абьяднаньне, «Гроднаабутак», КБМ.



Часткова ці цалкам у гэтым годзе не працавалі ўсе прадпрыемствы горада, акрамя прадпрыемстваў харчовай прамысловасьці. Агульныя страты працоўнага часу склалі 1 мільён 788 тысяч чалавекагадзін (на 18% больш, чым у мінулым годзе).

З 10 мільярдаў рублёў, запланаваных на будаўніцтва на першыя 9 месяцаў года, выдаткавана толькі 3,9 міліярда. За кошт бюджэта не пабудавана ніводнага метра жыльля. Замарожана будаўніцтва аптэчнага склада, інтэрнатаў медінстытуту і універсітэту, педвучылішча...

Дадайце да гэтай карціны стан з сацыяльным забесьпячэньнем адукацыі, культуры, медыцыны, рост злачыннасьці і стане відавочна, што тэндэнцыя да падзеньня ўзроўня жыцьця насельніцтва краіны працягваецца. Добрая міна пры кепскай гульні на тварах прадстаўнікоў дзяржавы сёньня можа выклікаць толькі агіду. Відавочна, што найдышоў час кардынальных рашэньняў, новых заканадаўчых актаў, здольных стварыць глебу для вываду эканомікі з крызісу. Надыйшоў час выбару: жыць ці існаваць. І кожны гэтае пытаньне для сябе павінен вырашыць сам.

В.МАЛЬСКІ

ГАРАДЗЕНЦЫ Ў ОЛЬШТЫНЕ

З 20 па 25 лістапада ў Ольштыне праходзіць трэнінгавы семінар па арганізацыі выбараў і досьведу працы мясцовага самакіраваньня, ў якім прымае ўдзел і гарадзенская філія Фонду імя Льва Сапегі. У склад нашай дэлегацыі ўваходзяць дэпутаты Саветаў розных узроўняў, журналісты, навукоўцы, прадстаўнікі грамадзкіх арганізацый з Горадні і Ваўкавыска. Пад час семінара, арганізаванага Ольштынскім цэнтрам самакіраваньня і Фондам Стэфана Баторыя, яго ўдзельнікі азнаёмяцца з арганізацыяй выбару ў мясцовыя органы ўлады ў Польшчы, з практычнай дзейнасьцю ўстаноў самакіраваньня.

В.Р.

ЦІ СТАНЕ ПОЛЬШЧА БЛІЖЭЙ?

У мінулую пятніцу скончыў сваю працу І міжнародны гарадзенскі кірмаш, у праграме якога ў спартыўнай зале медінстытуту працавала польская эканамічная прэзентацыя «Польэкспа - 95». Арганізатары выставы, удзел у якой бралі прадстаўнікі больш як 90 фірмаў, выступіла Польска-Літоўская гандлёвая палата Сувалак. Актыўныя кантакты Горадні і Сувалак на ўзроўні адміністрацыі рэгіёнаў пачаліся ў красавіку мінулага года. У наш горад з дзелавым візітам прыязджала гаспадарчая місія з Сувальшчызны, былі праведзены семінары ў Сувалках на тэмы, зьвязаныя з гаспадарчым правам і зараз арганізаваная вось гэтая выстава. Што чакалі ўдзельнікі кірмашу ад яе? На прэс-канферэнцыі ў дзень адкрыцьця на гэтае пытаньне адказваў дырэктар палаты Мар'юш Саломан.

- Гэта першая наша прэзентацыя ў Горадні з цыклу «Польэкспа», які прадстаўляе польскі бізнэс ва ўсіх усходнеэўрапейскіх краінах. Мы хацелі б, каб выстава заініцыявала ня толькі гаспадарчыя кантакты, ня толькі пашырэньне польскага экспарту на Беларусь, але і беларускага ў Польшчу.

Фундаментальнай праблемай, якая стрымлівае гандль, зьяўляецца мяжа, якая адпалохвае нашых бізнэсмэнаў. Таму «Польэкспа - 95» павінна засьведчыць, што нашыя дзелавыя колы маюць тут свае інтарэсы і жадаюць тут працаваць.

Сп. Саломан адзначыў таксама, што выставу фінансавалі сумесна фірмы-удзельніцы і Міністэрства зьнешнеэканамічных сувязяў Польшчы. Гарадзенскія ўлады паспрыялі расьсяленьню ўдзельнікаў кірмаша ў гатэлях па коштах, якія плоцяць грамадзяне Беларусі, што дазволіла зэканоміць значныя сродкі. Дзякуючы гэтаму, у Горадню змаглі прыехаць нават прадстаўнікі невялікіх польскіх фірмаў.

Марэк Катоўскі, Падлескае прадпрыемства інвалідаў.

- Мы да гэтага часу кантактаў з Горадняй ня мелі. Найлепшыя кантакты на Беларусі ў нас з Пінскай мэблевай фабрыкай. Супрацоўнічаем з ёй больш двух гадоў. Маем надзеі, што знойдзем і ў Горадні партнёраў.

- Якія праблемы стрымліваюць польска-беларускія гандлёвыя адносіны?

- Я мяркую, з польскага боку праблем няма, а з беларускага найбольшае - новыя мытныя падаткі.

Наступны наш суразмоўца - Урсула Кавальчык, прадстаўніца фірмы «Ленэкс-Морскув», якая вырабляе сокі «Но-Но».

- Маем надзею выйсьці на гарадзенскі рынак. Нашыя сокі добра вядомыя ўжо ў Маскве, але кантакты з вашай краінай, якая значна бліжэй, жадаюць быць лепшымі. Таму галоўнай мэтай нашага ўдзелу ў выставе зьяўляецца рэклама.

Сярод назваў фірмаў-удзельнікаў кірмашу можна было сустрэць і назвы беларускіх прадпрыемстваў. Падыходзім да стэнду віцебскага завода «Электравымяральнікі». Пачуўшы беларускую мову, жанчыны, прадстаўляўшыя прадукцыю так зьбянтэжыліся, што нават не пажадалі прадставіцца, а на пытаньні адказвалі на ўзроўні: «Да», «Нет», дзякуючы чаму на фоне ветлых і добразычлівых палякаў выглядалі белымі варонамі.

Агульнае добрае ўражаньне ад выставы падпсавалі гарадзенскія падлеткі, якія ў апошні дзень зграямі сноўдалі па павільёнах, жабравалі ёгурты, напоі, ручкі, цацкі, кралі ўсё, што ня так ляжала. У такім становішчы закрыцьцё «Польэкспа - 95» нагадвала панічнае бегства. І тым ня менш, надзея на тое, што такая блізкая для нас Польшча перастане быць «далёкім» замежжам, гандляваць з якім цяжэй, чым з Уладзівастокам, ёсьць. Трэба толькі, каб да ўлады ў краіне прыйшлі людзі, якія будуць кіравацца дзяржаўнымі, а не ідэалагічнымі інтарэсамі. Ці прыйдуць? Залежыць ад нас.

В.РУДНІК



СУМЕЖЖА

ЯБЛЫК З БАЦЬКОЎСКАГА САДУ

Хавалі тату ціха, бяз пампезных цырымоній, аркестра, гучных прамоваў. Толькі свае: дарослыя дзеці ды ўнукі. Выконваючы апошнюю волю нябожчыка, цела везьлі на Радзіму - у атручаную Чарнобылем зону. Захацеў, небарака, у роднай зямельцы ляжаць...

Усе гэтыя гады марыў вярнуцца дамоў, у адбудаваную сваімі рукамі хаціну з вялізным садам і агародам. Усе дзевяць год, што праляцелі з таго чорнага дня, калі на іх зямлю прыйшла радыяцыйная гібель і прымусіла вырваць карані з родных мясьцін, жыў надзеяй на вяртаньне. Колькі разоў намагаўся пакінуць няўтульныя гарадзкія сьцены! Колькі разоў, ужо хворы, прасіў вярнуць яго туды, дзе ён быў шчасьлівы, дзе зьведаў радасьць і каханьне, дзе прайшло жыцьцё!

Чарнобыль зламаў, разбурыў яго. Адабраў здароўе, сілы, памяць. Як не прыжываецца старое дрэва на новым перасушаным месцы, так ня змог прыжыцца ў новай кватэры стары Сямён - перасяленец з зоны...

Кажуць, без мінулага няма будучыні. Можа яно й праўда гэтак? Страціўшы мінулае, страціўшы самае дарагое - родны куточак, прытулак, людзі паміралі ня толькі ад радыяцыі. Ад невыноснай тугі паміралі... Маладым было лягчэй. Яны толькі пачыналі жыцьцё. Ім, урэшце рэшт, усё роўна, дзе яго пачынаць.

...Грамыкі сустрэлі пахавальную працэсію жудаснай цішынёй. Толькі вецер сьвістаў у галінках недагледжаных дрэваў і зьдзічэлых кустоў. Хаты, патанаючыя ў зарасьніках пустазельля, глядзелі пустымі вачніцамі. Нейкія нелюдзі павыдзіралі ваконныя рамы, дзьверы, разабралі падлогу. Няўжо разбагацелі на чалавечым горы?

Ля бацькоўскай хаты спыніліся. «Вось, татачка, мы й дома...» - прашаптала Надзя. Да болю знаёмыя мясьціны здаваліся «мёртвым горадам» з некалі любімай казкі. Не брахалі сабакі, не крычалі пеўні, не мыкалі каровы, не зьвінелі калодзежныя ланцугі... Не сьпяшаліся, як раней, падзяліць гора суседзі. Толькі сьляпая бабулька - адзіная на ўсю вёску жыхарка, якая засталася чакаць сьмерці ў роднай хаце, выйшла на гук пад'ехаўшага транспарту: «Вы хто?»

- Свае. Мы тату хаваць прывезьлі...

...У бацькоўскім садзе пасьпелі яблыкі. Яблыні, некалі любоўна пасаджаныя татам, гнуліся ад вялізных чырвоных пладоў. Водар восеньскага саду і прэлай лістоты дурманіў галовы. Гэта быў пах дзяцінства. Забыты і далёкі... Ішоў дзесяты год пасьля Чарнобыльскай бяды...

Першай не вытрывала Надзя. Яна сарвала і надкусіла празрысты наліўны яблык з нейкім невытлумачальным адчаем...

* * *

Назад ад'язджалі позна. Густая цемра запоўніла навакольле, пажыраючы ў сваім чрэве бязьлюдныя хаты і падворкі. І толькі на вясковых могілках блукалі агеньчыкі: сьвечы аплаквалі тых, хто некалі жыў тут, кахаў, будаваў, нараджаў дзяцей.

Пакідаючы мёртвага бацьку ў мёртвай вёсцы, Надзя прыціскала да грудзей яблык з бацькоўскага саду і суцяшала сябе думкай, што родны ёй чалавек, чыя душа заўсёды заставалася ў Грамыках, нарэшце, вярнуўся дамоў... Назаўсёды... Бо колькі б дарог не было ў жыцьці, яны абавязкова некалі канчаюцца...

Ала БІБІКАВА.

РАСЕЯ

У аўторак, 21-га, па «Маладзёжнаму каналу» Маскоўскага радыё прагучала выступленьне і адказы на пытаньні радыёслухачоў старшыні Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Расеі сп. Гушчына. Ён адзначыў, што вялікая Расея, нацыянальны гонар рускіх гінуць, былая веліч дзейнасьцю цяперашніх уладаў зьнішчана. Расею раздаюць, раскрадаюць і прадаюць, асабліва амерыканцам.

Расейскія гарады, вуліцы, гатэлі, рынкі запаланілі «лица кавказской национальности» і азіяты. Гэта яны чыняць разбой, напады, гвалцяць рускіх дзяўчат. Трэба ачысьціць Расею ад гэтых элементаў, і можна гэта зрабіць за 72 гадзіны пры дапамозе войска. Няхай у сябе будуюць Вялікі Азербайджан, Вялікі Узбекістан!

Чым не імперская палітыка царскай Расеі па барацьбе з «иноверцами» і «инородцами»?

А можа нядрэнна было б папрасіць усіх «наездников», якія ненавідзяць незалежную Беларусь, не паважаюць карэнных жыхароў, іх гісторыю, культуру і мову, прыехалі сюды на беларускае сала і каб праводзіць палітыку асіміляцыі і зьнішчэньня беларускай нацыі, пакінуць гэтую сьвятую зямлю, палітую крывёю продкаў, якія змагаліся з акупантамі з Захаду і Ўсходу, і будаваць у сябе на радзіме веліч расейскай дзяржавы? Гэтыя людзі прыехалі сюды каб праводзіць «политику партии и правительства», ачмураць тутэйшых людзей шалёнымі ідэямі марксізму-ленінізму, весьці іх у сьветлую камуністычную будучыню, абіраючы да ніткі матэрыяльна і духоўна, робячы з гаспадароў гэтай зямлі, данай нам Богам, бязроднага, тупога, абыякавага «советского человека» - саўка.

Гэтыя людзі ня маюць нічога агульнага з нашай зямлёй, яна зьяўляецца толькі іх месцам жыхарства і правядзеньня антынароднай палітыкі. Гэта не народ Беларусі, а толькі частка насельніцтва.

Далей старшыня НДПР, гаворачы пра Чачню, адзначыў, што супраціў народу трэба задушыць авіяцыяй і другімі сродкамі, каб ня гінулі расейскія хлопцы ад чачэнскіх снайпераў.

За цяперашняе становішча Расеі нясуць адказнасьць, у першую чаргу, Козыраў, Чарнамырдзін, Чубайс і др. Апошні не такая важная фігура, якім быў калісьці Троцкі, якога нават у Мексіцы змаглі забіць.

Расею даўно ўжо пара перастаць раздаваць, а трэба прырошчваць. Калі б не такі слабы і бязвольны ўрад, даўно бы адбылося аб'яднаньне з Беларусьсю.

Што можна яшчэ дадаць? Беларусь даўно ўжо згодна, сама просіцца, толькі Расея марудзіць «приростить Северо-Западный край»?

Ю.Г.

ПОЛЬШЧА

У нядзелю, 19 лістапада, у Польшчы адбыўся другі тур выбараў прэзідэнта краіны. На гэтую пасаду прэтэндавалі цяперашні прэзідэнт Лех Валэнса і лідар левых сілаў (былых камуністаў) Аляксандр Квасьнеўскі.

У панядзелак дзяржаўная выбарчая камісія паведаміла афіцыйныя вынікі выбараў. Перамог і стаў прэзідэнтам Польшчы А.Квасьнеўскі, які атрымаў 51,72 % сапраўдных галасоў. За Л.Валэнсу прагаласавала 48,28% выбаршчыкаў. Выбары праводзіліся толькі на тэрыторыі РП, польскія грамадзяне за мяжой не галасавалі. У абсалютных лічбах Квасьнеўскі атрымаў на 646.263 галасы больш. З 28.062.409 чалавек, маючых права, прынялі ўдзел у галасаваньні 19.146.496, гэта амаль 70%.

Аляксандр Квасьнеўскі мае 41 год, нарадзіўся ў Бялогардзе на поўначы Польшчы, адукацыя вышэйшая па зьнешнеэканамічных зносінах. Прымаў актыўны ўдзел у камуністычных маладзёжных арганізацыях, працаваў журналістам, быў у двух апошніх камуністычных урадах краіны. Прадстаўляе аб'яднаньне левых (былых камуністычных) сіл Польшчы, зьяўляецца старшынёй Камісіі сейма (дарэчы ў сейме большасць былых камуністаў) па распрацоўцы новай Канстытуцыі. Жанаты, мае дачку. Ну а яшчэ, калі цікава, мае кватэру 75 кв. м, зямельны ўчастак пад будаўніцтва, ды яшчэ адзін участак для адпачынку.

Выступіўшы пасьля афіцыйнага абвяшчэньня вынікаў выбараў, А.Квасьнеўскі падзякаваў сваім прыхільнікам, але адзначыў, што ён будзе прэзідэнтам усяго народа. Ён адзначыў вялікую гістарычную ролю свайго контркандыдата Л.Валэнсы, маючы надзею, што апошні можа многа зрабіць для Польшчы і будзе супрацоўнічаць. Квасьнеўскі запэўніў, што пачатыя ў 1989 годзе рэформы і надалей будуць праводзіцца, Польшча будзе рабіць усё, каб увайсьці ў эўрапейскае супольніцтва і НАТА.

Новы прэзідэнт будзе прыведзены да прысягі 23 сьнежня, якраз перад Калядамі.

Выступаўшы раней, прэзідэнт Лех Валэнса сказаў, што ён не чакаў такіх вынікаў выбараў, але выбар грамадства трэба паважаць.

У цырымоніі прыняцьця прысягі новым прэзідэнтам ён прымаць удзел ня будзе, сустракацца і размаўляць з Квасьнеўскім не зьбіраецца, знакі ўлады і годнасьці прэзідэнта, якія атрымаў ад астатняга прэзідэнта Польшчы на эміграцыі, не аддасьць.

Л.Валэнса зазначыў, што ў яго яшчэ хапае энергіі і ён будзе езьдзіць па краіне, сустракацца з людзьмі і выкрываць перадвыбарчую хлусьню Квасьнеўскага, яго палітыку і абяцанкі, асабліва пра працу і кватэры для моладзі. Гэта будуць ня вулічныя баталіі, а палітычная барацьба. «Вось толькі цяпер пачнецца танец!» - сказаў ён. «Я атрымаў ад некаторых аплявуху. Але цяпер яе так аддам, як сказана ў «Старым запавеце», што аж сківаца выскачыць» - дадаў Валэнса.

Разам з прэзідэнтам зьбіраюцца адыйсьці і падалі заявы аб адстаўцы міністры замежных і ўнутраных спраў і абароны.

Уся ўлада ў Польшчы перайшла да былых камуністаў. Выбары сталі вялікай паразай каталіцкай царквы Польшчы, якая заўсёды падтрымлівала Леха Валэнсу. Як сказаў сакратар эпіскапату біскуп Пяронэк, цяпер настаў час роздуму, аналізу і выпрацоўкі стратэгіі ў сучаных умовах.

Час расставіць усё на свае месцы, час пакажа, што будзе далей, але, безумоўна, гэтыя падзеі ў Польшчы адгукнуцца і ў Беларусі.

С.ГАРАДЗЕНСКІ

Антон Фурс

МЫ ЗАЎСЁДЫ ЛІЧЫЛІ СЯБЕ БЕЛАРУСАМІ

(Заканчэньне. Пачатак у N 41)

Былі ўжо прыцемкі, калі ўвесь картэж (пешшу) накіраваўся да царквы, да якой было кіламетры 4 ад іх дома. Ішлі нейкімі сьцежкамі, лугамі, нават прыходзілася здымаць абутак, калі пераходзілі праз ручай. Прыйшлі ўжо, калі было зусім цёмна. Бацюшка адкрыў дзьверы, запаліў некалькі сьвечак і так у прыцемку, за закрытымі дзьвярыма прынялі шлюб Маня з Лёвам. Адкуль маладыя едуць у г.Глыбокае (там жыла маці Мані), каб потым выехаць у Інту, бо тут ніякіх персьпектываў для жыцьця ў іх не было.

Праз невялікі адрэзак часу я атрымліваю ліст ад Мані, каб абавязкова прыязджаў, бо прыехала Алеся. Я неадкладна еду. Калі зайшоў у пакой, убачыў прыгожую, сімпатычную дзяўчыну. Нас пазнаёмілі. Мы крыху паразмаўлялі і адразу адчулі, наколькі ў нас родныя душы, так многа было ў нас агульнага і ў сваёй долі, і ў поглядах, і ў перакананьнях. Адным словам - падабаліся адно аднаму. На другі дзень яна ад'язджала ў Паставы да сваіх сясьцёр. Я праводзіў яе на цягніку некалькі станцый, ня мог разьвітацца. Такой была наша першая сустрэча. Другі раз на сустрэчу з Алесяй я еду разам з Янкам Бабічам - сватам. Знаёмлюся з ейнай раднёй, дамаўляюся, што наступны раз я Алесю канчаткова забяру з сабой. Так я і зрабіў, пасьля чаго мы выехалі ў Карагандзінскую вобласьць, у пасёлак Новадолінка - туды, дзе я адбываў апошні тэрмін зьняволеньня. Тут і жылі амаль усё сваё жыцьцё.

Але чым даўжэй мы жылі ў Казахстане, тым больш хацелася пераехаць на Радзіму. Нарэшце мы адважыліся: адправілі ў Наваполацак дзяцей, дзе яны ўладкаваліся: дачка - на працу эканамістам, сын - у вучылішча нафтавікоў. А потым і мы ад'ехалі да іх, купілі ў брата Алесі паўхаты і пачалося наша пеньсійнае жыцьцё. Тут жыць хоць не лягчэй, але ўсё ж весялей сярод сваіх мясьцін. Часта наведваюць нас сябрыаднадумцы, за што мы вельмі ўдзячныя. Першымі наведаліся пісьменьнік Уладзімір Арлоў з жонкай. Гэта было незадоўга да сумнавядомых Дзядоў 1988-га года. Яны цікавіліся нашай арганізацыяй. Шмат чаго мы ім расказалі аб сваёй долі-нядолі. Усе былі вельмі расчуленыя, слухалі са сьлязамі на вачах. Вось менавіта гэтыя людзі і падштурхнулі нас, каб мы рабілі захады па рэабілітацыі. Але час тады яшчэ быў ня той, і толькі ў верасьні месяцы 1991 года мы падалі заяву аб рэабілітацыі на імя старшыні КДБ Беларусі сп. Шыркоўскага.

Зьмест заявы быў наступны (копія):

«Зьвяртаемся з просьбай аб рэабілітацыі арганізацыі «Саюз Беларускіх Патрыётаў (СБП), якая была створана ў 1945 годзе ў педвучылішчы г.Глыбокае і г.Паставы. Мэтай арганізацыі было «Адраджэньне Незалежнай Беларусі»»

Адказу мы не атрымалі...

У гэты час зьяўляюцца шматлікія артыкулы ў газетах «Наша слова», «Звязда», «Народнае слова», «Народная газета», «Настаўніцкая газета» і ў многіх раёнках. Пішуць пра СБП розныя людзі, у тым ліку і былыя яго члены. Першым закрануў гэтую тэму ў артыкуле «Патрыёты маўчаць не схацелі» Васіль Супрун. Ён зьмястоўна напісаў пра падпольле, якое дзейнічала ў пасьляваенны час. А дарогу гэтаму артыкулу, як, дарэчы, і многім іншым, адкрыў Э.Ялугін - рэдактар «Нашага слова». Ён жа напісаў і некалькі ўступных радкоў, у якіх выказаў шчырае жаданьне дапамагчы ў аднаўленьні справядлівасьці. Дзякуем яму за яго грамадзянскую мужнасьць.

Вядома ж, я і жонка адразу адгукнуліся двума артыкуламі: «Памяць -незагойная рана» (жонцын) і мой - «Усё яшчэ значымся ворагамі народа». Потым пісалі і Леў Бялевіч, Алесь Адамовіч, Люся Краенадубская, Герман Кірылаў, Тамара Барысюк, Альберт Ноўскі. Зьявіўся ў «Народнай газеце» артыкул нашага паэта, былога вязьня Сяргея Грахоўскага - з вялікім спачуваньнем у абарону нас. У Пастаўскай незалежнай газеце «Сумежжа», у «Звяздзе», у «Народным слове», а яшчэ раней і ў «Пастаўскім Краі» зьяўляюцца адзін за другім артыкулы карэспандэнта Алеся Касьценя. І ўсё гэта ў нашу абарону.

Потым я еду ў Менск і на кватэры Арловых знаёмлюся з народным дэпутатам Л.Баршчэўскім. Ён прапануе нам, кожнаму асабіста, напісаць заяву аб рэабілітацыі на імя народнага дэпутата РБ Г.Лавіцкага, які зьяўляецца намесьнікам старшыні КДБ Беларусі, а таксама знаходзіцца ў камісіі Вярхоўнага Савету па рэпрэсіях. Мы неадкладна пішам кожны ад сябе заяву, а Л.Баршчэўскі асабіста перадае іх сп.Лавіцкаму. Да гонару сп.Лавіцкага трэба зазначыць, што ён адразу ўзяў нашу справу пад асабісты кантроль і ў лістападзе 1992 года мы атрымалі першыя вынікі. Мы ведалі таксама, што многія нашы сябры яшчэ ў перадперабудовачны час пісалі заявы аб рэабілітацыі, але заўсёды атрымлівалі адмоўны адказ. А галоўным аргумантам такога адказу быў прыгавор суда з такімі словамі: « Отторжение Белоруссии от СССР». Але ж цяпер Беларусь «отторгнута». Яна незалежная, суверэнная. Атрымліваецца, за што мы змагаліся, тое цяпер вітаем і не павінна гэта быць нейкім злачынствам. Вось так, дзякуючы бясконцым клопатам, у тым ліку і нашым, амаль усе члены СБП былі рэабілітаваны, на жаль, многія пасьмяротна.

Заканчваю свой нарыс-споведзь. Няхай ён застанецца і маім блізкім, і ўсім, хто гэтым зацікавіцца.

Мы былі галодныя і халодныя. Мы ня мелі маладосьці - яна была бессаромна раскрыжавана на калючым дроце лагероў і турмаў. Але ж не шкадуем ні аб чым, бо мы засталіся людзьмі і тады, калі большасьць сьпявала хвалу тырану, і тады, калі былі ў няволі, і тады, калі вярнуліся дамоў. Дзе б мы ні былі, мы заўсёды жылі і думалі пра свой народ і сваю Бацькаўшчыну. І калі з нас ніхто ня стаў значнай асобай у якой-небудзь галіне жыцьця, то гэта толькі таму, што на ўзьлёце нам моцна падрэзалі крылы.

Жыцьцё нашых сяброў набліжаецца да канца, а многіх ужо і няма. Вельмі шкада, што мы, напэўна, не дажывем да часу, калі Беларусь будзе па-сапраўднаму Вольнай і Незалежнай. А выжывем мы як нацыя толькі тады, калі аб'яднаемся на нацыянальнай аснове. Іншага шляху проста няма. Асабліва аб гэтым трэба памятаць нашай моладзі. Мы верым, што новае пакаленьне давядзе нашу справу да канца, нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы і на наступ чорных сіл.

Жыве Беларусь!

ДАСЬЛЕДАВАНЬНІ



Станіслаў Суднік -паэт, публіцыст, гісторык, уласны карэспандэнт газеты «Пагоня». Жыхар горада Ліда, старшыня Лідзкай гарадзкой рады Беларускага Народнага Фронту «Адраджэньне», кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь па Лідзкай Камсамольскай выбарчай акрузе N 134.

Станіслаў Суднік

ЧЫН ЗА НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ

(да 75-х угодкаў Слуцкага збройнага чыну)

Беларускі адраджэнскі рух канца 80-х пачатку 90-х гадоў XX-га стагоддзя высьвяціў глабальную неаднароднасьць беларускага грамадзтва. Ня толькі розныя сацыяльныя пласты, але і розныя рэгіёны па-рознаму ставяцца да ідэі нацыянальнага адраджэньня, незалежнасьці Беларусі, беларускай мовы. Векавечныя крыўскія землі з Віцебскам, Полацкам, Воршай сталі апорным пунктам антыбеларускіх сілаў. Кволыя парасткі адраджэньня душацца тут глыбай расейскага шавінізму, халуйскага манкуртызму і калабарацыянізму. Непад'ёмнай цаліной, абыякавай да ўсяго, ляжыць Магілёўшчына. Безнадзейна б'юцца аб скалу абыякавасьці хвалі адраджэньня на Гомельшчыне. Ня можа акрыяць ад доўгага сну Меншчына. І толькі спрадвечна ліцьвінскія і дрыгавічскія землі яшчэ тлеюць прысакам свабоды.

Асаблівае месца сярод гэтых рэгіёнаў займае Случчына. Вотчына непакорных Алелькавічаў, абапіраючыся на лепшыя ў Беларусі землі, Случчына славілася багацьцем, заможнасьцю, адукаванасьцю і высокай сілай духу. Слуцак ні разу не адчыняў варотаў перад захопнікамі, цьвёрда трымаўся веры дзядоў. Нават слуцкая шляхта да гэтага часу засталася праваслаўнай. Але сёньня не чутно са Слуцка магутнага голасу ў абароны Беларусі, свабоды, незалежнасьці. Пасіўнасьць, абыякавасьць. У чым жа прычына? Каб адказаць на гэтае пытаньне, глянем на падзеі пачатку XX-га стагоддзя з пазіцый этнагенезу нацыі. Варта было ў апошнія гады глянуць на гісторыю Беларусі пачатку стагоддзя без бальшавіцкай зашоранасьці, каб зразумець, што бальшавізм ва ўсіх яго праявах быў чужы Беларусі і не ўспрымаўся нашым народам зьнізу да верху. Бальшавізм насаджаўся прыблудамі і сілай. Нават тыя рэпрэзэнтанты беларускага народу, якія сталі на бальшавіцкія пазіцыі, былі пазьней зьнішчаны, абвінавачаныя ў нацыяналізме і буржуазным дэмакратызме. Што ж датычыцца часу непасрэдна пасьля кастрычніцкага перавароту, то беларускі народ не прыняў яго адразу і рашуча.

На Беларусі пачалася самая сапраўдная вайна супраць чужой ідэалогіі і яе носьбітаў, а паколькі асноўнай масай нашага народу тады былі сяляне , то і вайну гэтую сьмела можна назваць сялянскай. Ужо вясной 1918 года паўстаюць Менскі, Гомельскі, Лепельскі, Слуцкі паветы. Летам 1918 года да іх далучаюцца Віцебскі, Горацкі, Сеньненскі, Полацкі, Аршанскі паветы. З 11 па 17 лістапада паўстаньнем была ахоплена ўся Віцебская губерня. Бальшавікі змушаны былі нават увесьці ваеннае становішча ў Дрысенскім павеце губерні. Паўстанцкі атрад у Вяліжы налічваў да 1000 чалавек. Вясна 1919 года пачалася са Стракапытаўскага роката. Быў утвораны «Палескі паўстанцкі камітэт». Камітэт падтрымалі Рагачоўскі і Клімавіцкі паветы. Гэтыя паўстаньні паклалі пачатак так званаму руху «зялёных», або пазьней руху «Зялёнага дуба». «Зялёныя» выступілі ў Горацкім, Рагачоўскім, Быхаўскім, Чэрыкаўскім паветах Гомельскай губерні. Да іх далучыліся Гарадоцкі і Полацкі паветы Віцебскай губерні. Беларусь палымнела. І прычына гэтаму была адна - бальшавізм. Ня так тэорыя, як практыка. Тэрор, ваенны камунізм, харчразьвёрсткі, рабунак. Зіма трохі прытушыла пажар, але з вясны 1920 года ўсё пайшло спачатку. Выбухнуў Быхаўскі павет. Бальшавікі ўводзяць ваеннае становішча па ўсёй Беларусі. У адказ паўстае ўся левабярэжная частка Гомельскай губерні, узьнікае Койданаўская самастойная рэспубліка.

Разрозьненыя сілы сялян не маглі доўга супрацьстаяць бальшавіцка-азіяцкім ордам. Паўстаньні душыліся. Паўстанцы гінулі. Сем'і зьнішчаліся, маёмасьць канфіскавалася. Кіраўніцтва Беларускай Народнай Рэспублікі не змагло ачоліць гэты рух і перш за ўсё з-за яго масавасьці, стыхійнасьці і непрадказальнасьці. Тады, увосень 1920, года гэта паспрабаваў зрабіць генерал Станіслаў Булак-Балаховіч. Асноўныя сілы генерала разьмяшчаліся ў раёне Мазыра, Пінска, Лунінца, Давыд-Гарадка. Добраахвотная армія Балаховіча мела пяхоту, коньніцу, артылерыю. У адпаведнасьці з планам армія павінна была выйсьці на лінію Оўруч-Мазыр-Жлобін і далей у раён Бабруйска і Барысава. 5 Лістапада армія перайшла ў наступ. 10 лістапада ў 16.40 быў узяты Мазыр. 14 лістапада армія выйшла ў раён Оўруча. Пад ударамі белахоўцаў бальшавікі пакаціліся на ўсход. У гэты ж час палякі пачалі адводзіць свае сілы за лінію Лань-Кіевічы, згодна з дамовай дасягнутай у Рызе паміж палякамі і бальшавікамі. Багатая і густанаселеная Случчына аказалася ў нейтральнай паласе. Слуцак не паўставаў аж з 1918 года. Дамоў вярнулася шмат афіцэраў і падафіцэраў з усіх армій. З бальшавіцкай турмы ўцёк і лідар слуцкага вызваленчага руху Павел Жыўрыд. 14 лістапада быў скліканы зьезд Случчыны. Зьехалася 107 дэлегатаў з 15 валасьцей. Старшынявау на зьезьдзе Васіль Русак, намесьнікам быў Уладзімір Пракулевіч. Зьезд абраў Раду Случчыны начале з У.Пракулевічам і прыняў рэзалюцыю:

« Першы зьезд Случчыны, скліканы ў ліку 107 асобаў, вітае Найвышэйшую Раду Беларускае Народнае Рэспублікі і заяўляе, што ўсе свае сілы аддасьць на адбудову Бацькаўшчыны, катэгарычна пратэстуе супраць заняцьця нашай Бацькаўшчыны чужынцамі і самазванымі савецкімі ўладамі. Хай жыве вольная, незалежная Народная Беларуская Рэспубліка ў яе этнаграфічных межах.»

Зьезд працаваў 15 і 16 лістапада. Ён аб'явіў Слуцкі павет дзяржаўнай тэрыторыяй Беларускай Народнай Рэспублікі. Ён прызнаў над сабой уладу Найвышэйшай Рады БНР, якую ўзначальваў Антон Луцкевіч. Зьезд прыняў вызначэньне на стварэньне збройных сілаў Случчыны. На зьездзе прысутнічалі прадстаўнікі Булак-Булаховіча. Збройныя сілы Случчыны фактычна маглі стаць левым флангам Добраахвотнай арміі, але, калі ў Слуцку была аб'яўлена мабілізацыя, генерал 17 лістапада быў выбіты з Мазыра. У раёне Семежава пачынаюць фармавацца Першы Беларускі Слуцкі полк пад камандай падпалкоўніка Гаўрыловіча і Другі Беларускі Грозаўскі полк пад камандай капітана Семянюка.

26 лістапада пад ударамі 16й чырвонай дывізіі войскі Булак-Булаховіча адыйшлі да польскай мяжы і пачалі пераход праз яе. 27 лістапада камандзір Першай Слуцкай брыгады Антон Сокал-Кутылоўскі кінуў абодва палкі, усяго больш за 10000 тысяч жаўнераў, супраць бальшавікоў. Моцныя ўдары былі нанесены па лініі Капыль-Вызна-Цімкавічы. Супраць случакоў была кінута Омская дывізія Чырвонай Арміі. Уся Беларусь па абодва бакі мяжы сачыла за няроўным змаганьнем . Гарадзенскія дзяўчаты вышылі і перадалі Першаму Слуцкаму палку баявы штандар з Пагоняй.

Абарона Случчыны трывала больш месяца. Толькі 28 сьнежня 1920 года паўстанцы з боем перайшлі польска-савецкую дэмаркацыйную лінію і былі абяззброены палякамі. Случчына страціла 10000 лепшых сваіх сыноў. Большасьць з тых, хто застаўся ў жывых, ніколі ўжо не вярнуліся на Радзіму.

Разгром Слуцка, аднак, не спыніў вызвольны рух. Беларусы працягвалі змагацца. Так жа няўзгоднена, стыхійна і... масава. Але ў 1921 годзе ўжо адчувалася каардынацыя. «Зялёны дуб» усё шырэй раскідваў свае галіны. Яго атрады налічвалі сотні чалавек. Асабліва вызначалася Польска-Менская група Лабунова-Кацiна. Гэтая група, а таксама атрады Паўлоўскага, Моніча, Караткевіча, Галака, Жыгалава ўяўлялі сабой рэгулярныя часткі з кулямётамі і артылерыяй. 11 ліпеня 1921 года бальшавікі зноў увялі па ўсёй Беларусі ваеннае становішча. Запрацавала машына рэпрэсій. Толькі ў жніўні 1921 года Якаў Ольскі, старшыня Беларускай ЧК, адправіў у Архангельскую і Валагоцкую губерні 30 вагонаў з сем'ямі паўстанцаў. Рэўтрыбунал БССР у 1921 годзе разгледзеў 492 справы, па якіх праходзіла 1456 падсудных. 252 чалавекі былі прыгавораны да расстрэлу. Загінуў у баі Мяфодзій Караткевіч. Агент ЧК засек сякерай Івана Галака. За 20 дзён жніўня 1921 года было забіта 300 зялёнадубаўцаў. У адным толькі Ігуменскім павеце было пералоўлена 560 паўстанцаў. Пад корань была выразана сям'я Станіслава Булак-Булаховіча, яго маці, браты, а маёнтак у Браслаўскім павеце зраўнялі з зямлёй. Ацалеў толькі брат Язэп, які ўвесь час быў побач з генералам і зьяўляўся афіцэрам добраахвотнай арміі.

Рэпрэсіі 1921 года былі толькі пачаткам. Зламаўшы актыўны збройны супраціў беларускіх патрыётаў, бальшавікі пачалі помсьціцца на ўсім народзе. Раскулачваньне, канцэнтрацыйныя лагеры, рабункі, расстрэлы і цягнікі, цягнікі, цягнікі. Адусюль, з кожнай губерні, з кожнага павета. Згадалі ўсё: і 18-ты, і 19-ты, і 20-ты, і 21-шы. Не мінуў гэты лёс і Случчыны. Вывозілася цэлыя вёскі пагалоўна. Вывозілася якая-кольвечы інтэлігенцыя, сьвятары. Вывозіліся тыя, каго ўдавалі, і тыя хто не ўдаваў. Вывозіліся, праўда, і стукачы. Фабрыкаваліся справы накшталт Лістападаўскай. Так было паўсюль, але на Случчыне асабліва. Случчына абязьлюдзела. У вёсках засталася адна галота, якая ня ўмела, не хацела, ці не магла працаваць. Гэтых бедных людзей рабілі саўдзельнікамі злачынстваў. Паміж імі дзялілі маёмасьць раскулачаных і высланых. Вызваленыя ад насельніцтва тэрыторыі запаўняліся войскамі. За савецкія часы вакол Слуцка было больш чым 1,5 дзесяткі вайсковых гарадкоў. Багацейшыя слуцкія чарназёмы адводзіліся пад танкадромы, аэрадромы, пазіцыі стратэгічных і тактычных ракетаў і іншую пакасьць.

Рэпрэсіі вырашалі адну галоўную задачу - выкараніць вольналюбства і нацыянальную сьвядомасьць да генетычнага ўзроўню. І ва Усходняй Беларусі яны з гэтай задачай справіліся. Ва Ўсходняй Беларусі беларускі народ быў зьліквідаваны. Таму мы і маем зараз тое, што маем. Поўны нацыянальны нігілізм. Шмат пасьпелі яны і ў Заходняй. Але тут у іх было менеі часу. Тут менеі прыблудаў, менеі манкуртаў. Тут яшчэ тлее сьвядомасьць, але ёсьць свая бяда і тут. Гэтая бяда - страх. Страх да генетычнага ўзроўню. Страх перад любой уладай, перад любым начальнікам. Страх уласны і страх вучыць дзяцей, каб дзеці хацяб не баяліся. Таму ніхто з тых, хто разумее гэтыя зьмены, якія адбыліся з некалі ганаровымі і непакорнымі ліцьвінамі, не зьдзіўляецца ні вынікам выбараў, ні вынікам рэферэндумаў. Зьдзіўляцца трэба іншаму. На Беларусі за ідэі нацыянальнага адраджэньня стабільна галасуе зараз каля 30% насельніцтва. Як ім удалося захавацца, як пераадолець вірусы манкурцтва і страху? Але яны ёсьць. Ёсьць тры мільёны беларускага народу і з кожным днём становіцца ўсё болей. Прыдзе час, і нас стане большасьць ва ўласнай краіне. І тады можна будзе сказаць , што наш чын за незалежнасьць быў ня марным.

РАЗЬВІТАНЬНЕ

Адыйшоўшы кастрычнік завяршыўся сумнай падзеяй жалобы і смутку. Разам з ранішнім пахаладкам і пажоўклым лісьцем, закончыў свой зямны шлях нястомны патрыёт зямлі Беларускай, бескампрамісны і нястомны змагар за ягонае шчасьце, таленавіты паэт Лявонцій Раманавіч Случчанін (Шпакоўскі).

Жалобная паніхіда на Салігорскіх могілках адбылася 26 кастрычніка а трэцця гадзіне дня.

Прайшоўшы амаль усе этапы Сталінскага Гулага:Беламорканал, Варкуту, Комі - паэт заўсёды заставаўся верным сваім ідэалам - ідэалам незалежнай, квітнеючай, вольнай Беларусі.

Вам трэба прызнаньне было да зарэзу,
Як дождж/к патрэбен лістоце,траве.
І прыкра, што кветачка Вашага Бэзу
Ужо не застане паэта ўжывых.
Паэта, хто марыў пра волю народа,
Якому крычаў трыццаць сёмы «А-ту!»,
Паэт ня згубляў сваёй годнасьці зроду,
Хаця на каленях прапоўз Варкуту.

Гэта радкі з верша Хведара Гурыновіча, прачытаные над магілай Л.Случчаніна.Даніну памяці выдатнаму сыну Случчыны аддалі ў гэты дзень прадстаўнікі розных прадпрыемстваў горада, вядомыя журналісты, дэмакратычна настроеная інтэлігенцыя, мясцовая філія БНФ і Грамады, сябры і паплечнікі, родныя нябожчыка.

АЛЕСЬ БАШКО

Праграма тэлеперадач

Панядзелак, 27 лістапада

Белорусское телевидение

7.35 Утренний коктейль. 7.50 Мультфильм. 8.00 «Реквием для голоса и фортепьяно». Худ.фильм. 3-я серия. 9.00 Финансовое время. 9.15 Мультфильмы. 9.55 «Золотой ключик». Худ. фильм. 11.10 Компьютерный полигон. 11.35 Концерт Государственного академического народного хора Беларуси. 12.35 «Белвидеоцентр» представляет: «Зоя Литвинова». Док.фильм. 15.00 Новости. 15.10 По вашим просьбам. «Ах, водевиль, водевиль...» Худ. фильм. 16.15 ТВ - школе. 2-й класс. Удивительный мир животных. 16.30 К 65-летию Владимира Короткевича. «Синее, синее...» Телеспектакль. 17.30 «Профилактика сахарного диабета». Беседа с профессором Е.А.Холодовой. 17.45 Музыкальный антракт. 18.00 Новости (с сурдопереводом), Би-би-си, Си-эн-эн. 18.45 «Трижды один». Музыкальная передача MTV. 19.00 «Золотой шлягер-95». Международный музыкальный праздник. Часть 1-я. 20.40 Колыбельная. 21.00 Новости. 21.45 «Золотой шлягер-95». Международный музыкальный праздник. Часть 2-я. 23.25 Новости. 23.40 Спортивный телекурьер. 24.00 Экономикст. 0.10 Под куполом Вселенной. **ГРОДНО:** 16.30 Премьера кино. 17.30 В музыке ищу я вдохновенья. Играет М.Белошук. 18.10 Радар. 18.30 Дела военные. 18.45 Дневник Принеманья.

ОРТ

5.00 Телеутро 7.30, 18.05 «Выборы-95» 8.00, 11.00, 17.00, 23.00 Новости 8.15, 17.20 «Тропиканка» 9.00 Что? Где? Когда? 10.10 Мультфильм 10.30, 18.35 Угадай мелодию 19.00 «Если». Ведущий -В.Познер 19.45 Спокойной ночи, малыши! 20.00 Время 20.50 «Электронные жучки» Детектив 21.50 «Загадки истории. Иоанн Мучитель» ч.2-я 22.35 Муз. программа

Канал «Россия»

6.30 Время деловых людей. 7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести. 7.25 Требуются...требуются... 7.30 Звезды говорят. 7.35 Ритмика. 7.50 Всего понемногу. 8.25 Телегазета. 8.30, 17.40 Выборы-95. Государственная Дума. 9.00 «Мы еше живы...» 9.40 Мульти-пульти. 9.50 Ключевой момент. 10.20 Милицейская хроника. 10.30 От нашего корреспондента. Судьбы. 10.45 Мульти-пульти. 11.05 Клип-антракт. А.Губин, Линда. 11.15 Новая линия. 15.05 Там-там новости. 15.20 Праздник каждый день. 15.30 Полчаса на чудеса. 16.20 Новая линия. 16.45 Спасение 911. 18.10 Клуб избирателей. 18.15 «Высокая мода» в Москве. Дневник фестиваля. 18.25 Устами младенца. 19.25 Подробности. 19.35 «Почти безнадежное дело». Худ.фильм. Часть 2-я. 20.45 Репортер. 21.00 Прогноз погоды. 21.05 Момент истины. 22.30 Река времени. 22.35 Автомиг. 22.40 Служба 299-00-00. 22.55 Интервью Председателя Государственной Думы И.П.Рыбкина. 23.25 «Гонка за жизнью». Худ.фильм (Италия). 3 я серия. 0.15 Джаз-клуб. Э.Комон. Передача 1-я.

Санкт-Петербург

17.00, 20.00 Выборы-95. 17.40 Параллельный город. 18.05 Телемагазин. 18.10 Большой фестиваль. 18.30, 21.45 Информ ТВ. 18.50 Спортивные новости. 18.55 «Мануэла». Худ.фильм. 19.50 Телеслужба безопасности. 21.05 К юбилею Н.Мордюковой. Исповедь актрисы. 22.00 Спорт, спорт, спорт... 22.15 Портрет Президента Республики Беларусь А.Г.Лукашенко глазами оппозиции. 22.25 «Телекомпакт». Музыкальное шоу.

Польское телевидение

Программа 1

07 00 Кофе или чай? 08 45 Беседа. 09 00 «Мода на успех». Сериал пр-ва США. 09 30 Телетурнир для детей. 10 00 Новости. 10 10 Мама и я. 10 25 Дошкольники дома. 10 50 Гимнастика. 10 55 Поговорим о детях. 11 05 «Доктор Квинн». Сериал пр-ва США. 11 50 Музыкальная программа. 12 00 Тележурнал. 12 30 Публицистическая программа. 13 00 Новости. 13 10 Агробизнес. 13 15 Экономическая программа. 13 45 Тележурнал. 13 55 Документальный фильм. 14 25 Сила традиций. 14 40 Документальный фильм. 15 10 Знаешь ли что... 15 15 Чрезвычайный пересмотр. 15 35 Тайная история СССР. 15 50 Программа на вечер. 16 00 Для молодых зрителей. 16 30 «Мода на успех». Сериал пр-ва США. 17 00 Для молодежи. 17 25 Для детей. 18 00 Телеэкспресс. 18 20 Публицистическая программа. 19 10 «Марфи Браун». Сериал пр-ва США. 19 35 Юбилейная программа. 20 00 Вечеринка. 20 30 Новости. 21 10 Телетеатр. 23 00 Пульс дня. 23 15 Неделя президента. 23 25 Тележурнал. 23 40 Военный журнал. 00 05 Новости. 00 25 Документальный фильм.

Программа 2

08 00 Панорама. 08 10 Спортивная программа. 08 20 Утренний гость. 08 50 Академия здоровья. 09 00 Местная программа. 09 30 «Морк и Минди». Сериал пр-ва США. 10 00 Мир женщин. 10 30 Дикие горизонты. 10 55 Мультсериал. 11 00 Кроссворд. 11 25 Телетурнир. 11 50 Мультихобби. 12 20 Сообщество в культуре. 13 00 Документальный фильм. 14 00 Панорама. 14 20 «Хардкастл и Маккорник». Сериал пр-ва США. 15 10 Музыкальный журнал. 15 40 Музыкальные новости. 15 55 Приветствие. 16 00 Мультсериал. 16 30 Аппетит на здоровье. 17 00 Твой телефон безопасности. 17 30 Футбольный журнал. 18 00 Документальный фильм. 19 00 Панорама. 19 10 Местная программа. 20 05 Колесо фортуны. 20 30 Программа для детей. 21 00 «Шутки в сторону». Сериал пр-ва Англии. 21 30 Автожурнал. 22 00 Панорама. 22 40 «Остановка Аляска». Сериал пр-ва США. 23 25 Литературный журнал. 00 00 Тележурнал. 00 30 Криминальный журнал. 01 00 Панорама. 01 05 Концерт.

Аўторак, 28 лістапада

Белорусское телевидение

7.35 Утренний коктейль. 7.50 Экономикст. 8.00 Зеркало Си-эн-эн. 8.20 Авто-парк. 8.35 Конный спорт. Конкур. Новогрудский район. 9.00 ТВ - школе. 2-й класс. Удивительный мир животных. 9.15 «Лада ОМС» представляет: «Моя любовь, моя печаль». Телесериал. 9.45 Бездельник. 10.15 Туробъектив. Путешествия, встречи, отдых. 10.35 Золотая лира. Хит-парад белорусской песни. 11.25 К 65-летию Владимира Короткевича. «Листья каштанов». Телеспектакль. 15.00 Новости. 15.10 Торговый дом. 15.25 «Когда уходят снега». Короткометражный худ. фильм. 16.00 Мультфильм. 16.10 ТВ - школе. Белорусская литература. 11-й класс. «Разговор с наследниками». Пимен Панченко и его поэзия. 16.45 Уроки Н.Новожиловой. 17.15 Мост. 17.45 Музыкальный антракт. 18.00 Новости (с сурдопереводом), Би-би-си, Си-эн-эн. 18.45 «Трижды один». Музыкальная передача MTV. 19.00 Открытие III Международного телефестиваля «Сельский двор-95». 19.50 Телеанонс. 19.55 Зорная ростань. Телевизионный конкурс молодых артистов эстрады. 20.30 Скрижали. Иван Александрович Ильин. 20.35 Колыбельная. 21.00 Новости. 21.40 Пресс-конференция Президента Республики Беларусь Александра Григорьевича Лукашенко. 23.05 Музыка без границ. Музыкально-информационная программа. 23.45 Экономикст. 23.55 Под куполом Вселенной. **ГРОДНО:** 17.45 Разговоры по случаю. 18.10 Телевизионный кабинет власти. 18.50 Дневник Принеманья.

ОРТ

5.00 Телеутро 7.30, 18.05 «Выборы-95». Дебаты 8.00, 11.00, 17.00, 23.00 Новости 8.15, 17.20 «Тропиканка» 18.05 «Выборы-95». Дебаты 18.35 Угадай мелодию 19.00 Тема 19.45 Спокойной ночи, малыши! 20.00 Время 20.50 «Живет такой парень» Худ. фильм. 22.35 Москва. Кремль 22.50 Телешоу «50x50» 0.00 «Твин Пикс»

Канал «Россия»

6.30 Время деловых людей. 7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести. 7.25 Требуются... требуются... 7.30 Звезды говорят. 7.35 Ритмика. 7.50 Всего понемногу. 8.30, 17.40 Выборы-95. Государственная Дума. 9.05 Телегазета. 9.10 «Константин Симонов: остаюсь военным писателем». Док. фильм. 9.30 Судьба одного музея. 10.20 Милицейская хроника. 10.30 От нашего корреспондента. «Судьбы». 10.45 Клип-антракт. Дуэт «Черный, белый». 10.50 «Камень сновидений». Мультсериал. 11.15 Новая линия. 15.05 Там-там новости. 15.20 Компас «Роста». 15.50 Месяцеслов. 16.20 Новая линия. 16.50 «Камень сновидений». Мультсериал. 17.15 Ваш партнер. 17.30 Клуб избирателей. 18.10 L-клуб. 19.25 Подробности. 19.35 Н.Мордюкова в фильме «Женитьба Бальзаминова». 21.10 Киноафиша. 21.25 Прогноз погоды. 21.30 Лидер-прогноз. 22.30 Река времени. 22.35 Автомиг. 22.40 Служба 299-00-00. 22.55 Карьера. 23.25 Экран криминальных сообщений. 23.35 «Гонка за жизнью». Худ.фильм (Италия). 4-я серия. 0.30 Джаз-клуб. Э.Комон. Передача 2-я.

Санкт-Петербург

12.00, 18.30, 21.45 Информ ТВ. 12.10 Стиль жизни. 12.25, 14.30 Музыкальный момент. 12.30 «Немецкая волна». 12.45 Мультфильм. 13.00 Скорая помощь. 13.35 «Мануэла». Худ. фильм. 14.20 Советы садоводам. 16.50 По всей России. 17.00, 20.00 Выборы-95. 17.40 Показывает Ленинградская областная телекомпания. 18.05 Телемагазин. 18.10 Большой фестиваль. 18.50 Спортивные новости. 18.55 «Мануэла». Худ. фильм. 19.50 Телеслужба безопасности. 21.00 Футбол. Финал Межконтинентального кубка из Токио. «Аякс» (Голландия) - «Гремино» (Бразилия). 22.45 «Долгой жизни сеньоре». Худ. фильм (Италия).

Польское телевидение

Программа 1

07 00 Кофе или чай? 08 45 Беседа. 09 00 «Альберт - пятый мушкетер». Мультсериал. 09 30 Телетурнир. 10 00 Новости. 10 10 Мама и я. 10 25 Дошкольники дома. 10 50 Гимнастика. 10 55 Поговорим о детях. 11 00 «Бруклинский мост». Сериал пр-ва США. 11 50 Музыкальная программа. 12 00 Рынок труда. 12 20 Люди - лягушки. 12 30 Киножурнал. 12 50 Домашний юрист. 13 00 Новости. 13 10 Агробизнес. 13 15 Сельскохозяйственная программа. 13 40 Компьютерная школа. 14 00 Тележурнал. 14 25 Джойстик. 14 45 Из истории техники. 15 00 Атом, звезды. жизнь. 15 15 Счет математики. 15 30 Научно-популярный журнал. 15 50 Программа на вечер. 16 00 Музыкальная программа. 16 30 «Новые приключения Черного князя». Сериал пр-ва Англии. 17 00 Журнал харцеров. 17 25 Тик-так. 18 00 Телеэкспресс. 18 20 Лицом к лицу. 19 00 Мультсериал. 19 30 Чрезвычайный пересмотр. 20 00 Вечеринка. 20 30 Новости. 21 10 Художественный фильм. 22 35 Пульс дня. 22 50 Сеймограф. 23 05 Дело для репортера. 00 00 Новости. 00 15 Документальный фильм. 02 15 Развлекательная программа.

Программа 2

08 00 Панорама. 08 10 Спортивная программа. 08 20 Утренний гость. 08 50 Академия здоровья. 09 00 Местная программа. 09 30 «Фитнесс клуб». Сериал пр-ва Польши. 10 00 Мир женщин. 10 30 Документальный сериал. 11 00 Программа для детей. 11 25 Телетурнир. 11 50 Путешествие во времени и пространстве. 12 45 Мои книги. 13 05 Народные песни и танцы. 13 50 Академия здоровья. 14 00 Панорама. 14 20 «Запретная любовь». Сериал пр-ва Испании. 15 10 Рок-журнал. 15 40 Спортивная студия. 15 55 Приветствие. 16 00 Сериал пр-ва Австралии. 16 30 Спортивная студия. 17 00 Исторический журнал. 17 30 Телетурнир. 18 00 Тележурнал. 18 30 Тени жизни. 18 40 Католическая программа. 19 00 Панорама. 19 10 Местная программа. 20 05 Телетурнир. 20 35 Программа для детей. 21 00 Развлекательная программа. 21 50 Спортивная программа. 22 00 Панорама. 22 30 Тележурнал. 22 35 Экологическая программа. 22 45 Репортеры представляют. 23 10 «Дела греховные». Фильм пр-ва Польши. 01 20 Панорама.

Серада, 29 лістапада

Белорусское телевидение

8.00 «Хорошки». Фильм-концерт. 8.30 Здоровье. Тележурнал. К Всемирному дню профилактики СПИДа. 9.00 Голоса прошлого. Композитор Матей Радзивилл. 9.40 «Триал: знакомый незнакомец». Спортивная передача. 10.10 К 100-летию мирового кинематографа. «Жизнь моя - кинематограф». Док.фильм. Премьера худ.фильма «...Аз воздам». 1-я и 2-я серии. 13.10 Секретер. Информационно-познавательная программа. 13.50 «Лада ОМС» представляет: «Моя любовь, моя печаль». Телесериал. 14.50 Мультфильм. 15.00 Приглашаем на вечорки. Фольклорные коллективы деревень Петриковского района. 15.40 «Премьера». Творческое объединение «Телефильм» представляет: «Варианты острых углов». Док.фильм. 16.40 Злободневно. Проблемы энергосбережения. Принимает участие заместитель министра топлива и энергетики Беларуси Л.А.Дубовик. 17.30 К 65-летию Владимира Короткевича. «Книгоноши». Телеспектакль. 18.25 Ш Международный телефестиваль «Сельский двор-95». 18.55 Классика на экране. «Невероятное пари, или Истинное происшествие, благополучно завершившееся сто лет назад». Худ. фильм. 20.10 Темная комната. Большие секреты маленького бизнеса. 20.35 Колыбельная. 21.00 Новости. 21.45 По вашим просьбам. «Жестокий романс». Худ. фильм. 1-я серия. 22.55 «Крок». «Большая Медведица». Кино и видео для молодежи. 23.15 Новости. 23.30 Экономикст. 23.40 Столица. Тележурнал. 23.55 Волчок-шоу. Пародийно-развлекательная программа. 0.25 Под куполом Вселенной.

ОРТ

5.00 Телеутро 7.30, 18.05 «Выборы-95». Дебаты 8.00 11.00 14.00 17.00 23.00 Новости 8.15 17.20 «Тропиканка» 9.00 Тема 9.45 В мире животных 10.20 Мультфильмы 10.30 «Угадай мелодию» 14.20 «Виджит спешит на помощь» Мультсериал 14.40 Кактус и Ко 14.50 До-ми-соль 15.10 Зов джунглей 15.35 «Элен и ребята» 16.00 Тет-а-тет 16.30 Семь дней спорта 19.00 «Арбатский парламент» -Включись!». Передача 2-я. 19.45 Спокойной ночи, малыши! 20.00 Время 20.50 «Комиссар». Худ. фильм 23.10 Пресс-клуб 0.05 «Твин Пикс» 0.55 Семь дней спорта

Канал «Россия»

6.30 Время деловых людей. 7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести. 7.25 Требуются...требуются... 7.30 Звезды говорят. 7.35 Ритмика. 7.50 Всего понемногу. 8.10 Крестьянский вопрос. 8.30, 17.40 Выборы-95. Государственная Дума. 9.00 Телегазета. 9.05 «Санта-Барбара». Худ.фильм. 10.20 Чрезвычайный канал. «Живем и любим». 10.30 Непопулярная тема. 10.45 Клип-антракт. Е.Амирамов. 10.50 «Камень сновидений». Мультсериал. 11.15 Новая линия. 15.05 Там-там новости. 15.20 Праздник каждый день. 15.30 Чья сторона? 16.20 Дальний Восток. 16.50 «Камень сновидений». Мультсериал. 17.15 Кипрас Мажейка. Параллели. 17.25 Ваш партнер. 18.15 Клуб избирателей. 18.25 Своя игра. 19.25 Подробности. 19.35 «Санта-Барбара». Худ.фильм. 20.35 Домино Михаила Боярского. 21.05 Прогноз погоды. 21.10 Чрезвычайный канал. 22.30 Река времени. 22.35 Автомиг. 22.40 Служба 299-00-00. 22.55 Чемпионат Европы по баскетболу среди клубных команд. ЦСКА -»Ираклис» (Салоники, Греция). 23.40 «Геката». Худ. фильм (Швейцария-Франция).

Санкт-Петербург

